

ПОШУК ПАЧЫНАЛІ З РЫДЛЁЎКАЙ 5

ВЯРНУЦЦА З НЯБЫТУ. З ДАПАМОГАЙ «ЗВЯЗДЫ» 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІПЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 122 (28989)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НАША ГАЛОЎНАЕ СВЯТА

**ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!**

Віншую вас з вялікай гістарычнай датай — 75-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Днём Незалежнасці — святам, якое аб'ядноўвае нас у імкненні да міру, згоды і захавання гераічнага летапісу краіны.

Вялікая Айчынная вайна ўвайшла ў кожную сям'ю болем страт, прынесла гора і нечалавечыя пакуты мільёнам беларусаў, але абудзіла ў думках і сэрцах кожнага пачуццё нацыянальнага адзінства, грамадзянскага абавязку і гатоўнасці абараняць Радзіму да апошняга дыхання. Перамога над нацызмам стала актам найвышэйшай справядлівасці і сімвалам няскоранасці нашага народа.

У імя сваёй незалежнасці, гістарычнай праўды і міру на Зямлі мы заўсёды будзем шанаваць вялікі подзвіг старэйшых пакаленняў. Імкнуцца быць дастойнымі іх памяці. На прыкладзе жыцця сапраўдных герояў выхоўваць сваіх дзяцей і разам з імі ствараць будучыню Беларусі — суверэннай, моцнай, квітнеючай краіны.

Няхай над нашай роднай зямлёй заўсёды будзе чыстае неба.

Жадаю вам шчасця, дабра і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр Лукашэнка.**

Чвэрць стагоддзя 25

Чарговая публікацыя нашай рубрыкі, прысвечанай ажыццяўленню дакументаў, падпісаных кіраўніком дзяржавы, — аб рэалізацыі Дэкрэта № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі». СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

# ЯРКІЯ ЎСПАМІНЫ Ў СЭРЦЫ

**Вялікае спартыўнае свята, якім дзесяць дзён жыла ўся краіна, завяршылася. II Еўрапейскія гульні ўжо сталі гісторыяй**

**За ўзнагароды турніру змагаліся амаль чатыры тысячы спартсменаў, у медальным заліку па-за канкурэнцыяй аказаліся расіяне, на рахунку якіх 109 узнагарод. На другім месцы — гаспадары, беларусы заваявалі 69 медалёў, з іх 24 залатыя. Найбольшай папулярнасцю на Гульнях карысталіся такія віды спорту, як мастацкая гімнастыка, баскетбол 3х3, пляжны футбол, веласіпедны спорт і лёгкая атлетыка.**

Самым дарослым атлетам, які выступіў на турніры ў Мінску, стала 61-гадовая ізраільская бадмінтаністка Святлана Зільберман, а самая маладая — украінская акрабатка 14-гадовая Марыя Лось. Менш за ўсё спартсменаў прыехала з Ліхтэнштэйна — адзін чалавек (ён выступіў у дзюдо), а найбольш прадстаўнічай дэлегацыяй стала Расія (224 атлеты). Спаборніцтвы ўбачылі мільёны тэлегледачоў у 196 краінах свету. Медалістамі сталі атлеты з 43 краін. СТАР. 3



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

# БЕЛАРУСЬ — АДКРЫТАЯ КРАІНА

**Мінулая нядзеля ў рабочым графіку Прэзідэнта выдалася надзвычай насычаная. Перад цырымоніяй закрыцця ІІ Еўрапейскіх гульняў, што адбылася ўвечары на стадыёне «Дынама», кіраўнік дзяржавы сустрэўся з высокімі гасцямі, якія прыехалі, каб раздзяліць з Беларуссю радасць правядзення мультыспартыўных спаборніцтваў.**
**З Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным Аляксандр Лукашэнка правёў нефармальную сустрэчу на тэрыторыі дзяржаўнай рэзідэнцыі «Заслаўе». Пазней да іх далучыўся Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон. Гэту трохбаковую сустрэчу кіраўнік беларускай дзяржавы анансаваў падчас перагавораў са сваім таджыкскім калегам у пятніцу: «У нас ёсць пытанні ў рамках СНД і АДКБ, нашага абароннага саюза».**
**Аляксандр Лукашэнка правёў і тры рабочыя сустрэчы, тэмамі якіх сталі турызм, спорт і інвестыцыйнае супрацоўніцтва.**

### У 2020 годзе ў Беларусі пройдзе міжнароднае мерапрыемства па агратурызме

Гэта навіна прагучала на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з генеральным сакратаром Сусветнай турысцкай арганізацыі Зурабам Палалікашвілі.

«Галоўнае, што вы павінны разумець, — мы вельмі вялікую ўвагу надаём гэтаму кірунку», — звярнуўся кіраўнік краіны да генсека ЮНСТА і нагадаў, што грамадзяне больш чым 80 краін могуць прылятаць у Беларусь, знаёміцца з краінай без віз. А білет балельшчыка ІІ Еўрапейскіх гульняў даў магчымасць свабодна перасякаць мяжу ўсім ахвотным.

«Беларусь — дзяржава абсалютна адкрытая. У нас ёсць што паказаць свету, і той, хто вывучае краіны, заўсёды можа быць добрым госцем у нашай Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Зураб Палалікашвілі перш за ўсё падзякаваў Прэзідэнту за запрашэнне на ІІ Еўрапейскія гульні і магчымасць сустрэцца.

«У Беларусі не будзе больш аддана сябра ў ААН, чым я. Ніколі не забуду падтрымку, якую Беларусь аказвала мне на выбарах у ЮНСТА», — запэўніў генеральны сакратар.

Напярэдадні ён дэталёва пазнаёміўся з турыстычнымі праектамі нашай краіны, усёй інфраструктурай і адзначыў, што яна адна з найлепшых. «Выдатная інфраструктура, выдатныя людзі і гасціннасць, якая дала магчымасць адчуваць сябе як дома», — падкрэсліў Зураб Палалікашвілі.

Дзеля далейшага пашырэння ўзаемадзеяння з Беларуссю генеральны сакратар прапанаваў распрацаваць дарожную карту супрацоўніцтва, а таксама разгледзець магчымасць арганізацыі міжнароднага мерапрыемства, прысвечанага экалагічнаму і агратурызму ў адным з рэгіянальных гарадоў у 2020 годзе.

Арганізацыя планye абвясціць 2020-ы годам сельскагаспадарчага турызму. «Ідэя ў тым, каб падтрымліваць новыя напрамкі, выходзіць з мегаполісаў і праводзіць мерапрыемствы ў рэгіёнах. І ў гэтым Беларусь зноў вельмі добры прыклад для ўсіх», — растлумачыў генеральны сакратар ЮНСТА.

### Далёкія геаграфічна краіны зближаюцца

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся таксама з міністрам па пытаннях аднаўлення Японіі, міністрам па каардынацыі комплекснай палітыкі па пераадоленні наступстваў катастрофы на АЭС у Фукусіме Хіраміцi Ватанабэ.

У тым, што Японія — вельмі развітая, высокатэхналагічная краіна, Аляксандр Лукашэнка ўпэўніўся асабіста падчас візіту ў 1998 годзе.

Ды не толькі гэта наведванне. Я сур'ёзна цікаўлюся развіццём Японіі і японскага грамадства. Мы радуемся за вашы поспехі і перажываем, калі ў вас ёсць нейкія праблемы, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён упэўнены, што, нягледзячы на геаграфічную адлегласць, у Беларусі з Японіяй павінны быць наладжаны вельмі цесныя зносіны, асабліва ў галіне інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

Калі ўрад Японіі гатовы на гэта, то мы зробім усё вельмі хутка, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка і запрасіў карыстацца патэнцыялам Беларусі для рэалізацыі інтарэсаў еўрапейскай часткі планеты.

Прэзідэнт лічыць, што карысна было б пачаць з некалькіх сумесных інвестыцыйных праектаў у Беларусі, каб бліжэй пазнаёміцца, стварыць фундамент адносін. Кіраўнік Беларусі адзначыў і сур'ёзны досвед супрацоўніцтва ў пераадоленні наступстваў катастроф і трагедый: па яго словах, пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Японія першай працягнула руку дапамогі. Акрамя таго, праводзіліся сумесныя навуковыя распрацоўкі, і атрымалася так, што яны спатрэбіліся Японіі пасля Фукусімы.

Хіраміцi Ватанабэ выказаў Аляксандру Лукашэнку ўдзячнасць за каштоўную дапамагу пасля разбуральнага землятрусу на паўночным усходзе Японіі ў 2011 годзе і падзякаваў за запрашэнне на цырымонію закрыцця ІІ Еўрапейскіх гульняў.

«Гэта спрыяльная падзея, падчас якой шмат краін і народаў цесна пасябравалі праз спорт», — адзначыў міністр. Ён паведаміў, што бачыць перспектывы беларуска-японскага супрацоўніцтва таксама ў паглыбленні адносін у культуры, спорце.

«Для ўмацавання сувязяў паміж нашымі краінамі неабходна стварыць спрыяльны інвестыцыйны клімат. Трэба старацца сумесна», — падчас размовы з журналістамі выказаў упэўненасць Хіраміцi Ватанабэ.

### Поспехі беларускіх спартсменаў — падстава для гонару

Кіраўнік дзяржавы правёў сустрэчу з прэзідэнтам міжнароднага алімпійскага камітэта Томасам Бахам, алімпійскім чэмпіёнам. НАК Беларусі пастаянна супрацоўнічае з камітэтам, перш за ўсё па праграмах Алімпійскай салідарнасці, накіраваных на фінансаванне падрыхтоўкі і ўдзелу нацыянальнай каманды ў Алімпійскіх гульнях.

У размове з журналістамі прэзідэнт НАК перш за ўсё павіншаваў Беларусь з цудоўнымі поспехамі, якія прадэманстравалі спартсмены падчас ІІ Еўрапейскіх гульняў у Мінску.

«Гэта падстава ганарыцца для ўсяго беларускага народа. Я чуў вельмі добрыя водгукі пра арганізацыю гульняў: наколькі мне вядома, была задзейнічана велізарная колькасць валанцёраў. Шмат чуў пра спартыўныя аб'екты краіны — добра пабачыць на свае вочы», — паведаміў Томас Бах.

Таксама ён прызнаўся, што з нецярпеннем чакаў цырымонію закрыцця Гульняў, каб разам са спартсменамі, валанцёрамі, гледачамі атрымаць асалоду ад цудоўнага відовішча.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Перспектыва

# ГРОШЫ — НА ВЕТРЫ

**У Беларусі плануецца будоўля пяці ветрапаркаў**

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры садзейнічанні Праграмы развіцця ААН рэалізуе праект "Скасаванне бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі", паведаміла **начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля АЛЕЙНІКАВА** падчас круглага стала "Зялёнае гарадабудаўніцтва: ад тэорыі да практыкі" ў Палацы прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Па словах дакладчыцы, праект прадугледжвае падрыхтоўку пяці пляцовак пад будаўніцтва ветрапаркаў. Пазней актывы будуць прададзены інвестарам, якія забяспечаць стварэнне і эксплуатацыю ветраных электрастанцый. У Лёзненскім раёне такая пляцоўка выстаўлена на электронныя таргі.

«Адзін з прыярытэтных кірункаў у галіне зялёнай эканомікі — забеспячэнне энергетычнай бяспекі краіны. З 2002 да 2018 года прыцягнута больш за 730 мільёнаў долараў кліматычнага фінансавання міжнароднай тэхнічнай дапамогі», — паведаміла Наталля Алейнікава.

Яна падкрэсліла важнасць распрацоўкі стратэгіі нізкавугляроднага развіцця на мясцовым узроўні. У асноўным гэта датычыцца тых гарадоў і раёнаў, якія падпісалі Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі, — да гэтай ініцыятывы Еўрапейскага саюза далучылася ўжо больш за 45 населеных пунктаў краіны.

Нагадала начальнік упраўлення і пра тое, што, падпісаўшы Парыжскае пагадненне, Беларусь абавязалася не перавысіць узровень 96,1 мільёна тон выкідаў $CO_2$ у эквіваленце. Фактычна ў 2017 годзе ўзровень выкідаў парніковых газаў у краіне склаў 93,9 мільёна тон $CO_2$ у эквіваленце.

«Мэтанакіраваная работа па энергазберажэнні дазволіла досыць паспяхова зніжаць энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту пры амаль захаваных спажываных рэсурсах», — у сваю чаргу паведаміў **намеснік дырэктара дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Леанід ПАЛЯШЧУК.**

Па яго інфармацыі, доля ўзнаўляльных крыніц энергіі ў Беларусі цяпер павялічылася да 6,2 %. Да 2030 года плануецца павелічэнне да 10 % — большай часткай за кошт фотаэлектрычных станцый, біягазавых тэхналогій і гідраэлектрастанцый.

«У нас больш за 62 % будынкаў з павышаным энергаспажываннем на квадратны метр. Распрацаваны бізнес-план па павышэнні энергаэфектыўнасці і далейшай мадэрнізацыі жылля. У Гродзенскай і Магілёўскай абласцях, Мінску дзякуючы рэалізацыі тыпавых праектаў удзельнае спажыванне аказалася ў 2,4 раза ніжэйшым за рэспубліканскае», — паведаміў Леанід Паляшчук.

Мадэрнізацыя будынкаў накіравана на зніжэнне спажывання цяпла і, адпаведна, «аблягчэнне» жырокі для жыхароў.

«Калі замяніць вокны, частку камунікацый і правесці цеплавую мадэрнізацыю, штогадовая эканомія складзе 317 тысяч еўра. А дадатковае ўцяпленне агароджвальных канструкцый, дахаў і сутарэнняў дапамажа зберагчы 1,6 мільёна еўра штогод», — прывёў лічбы намеснік дырэктара.

«Вельмі прыемна, што ўпершыню ў гісторыі прыняты законапраект аб арганічнай прадукцыі. Такім чынам парламент надае ўвагу добраму, якаснаму харчоваму прадукту, без якога не бывае здароўя нацыі», — выказаў **упэўненасць намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК.**

Ён асабліва адзначыў і новы кірунак, які апошнім часам хутка развіваецца, — электратранспарт. На думку Баляслава Пірштука, за электрамабілямі і электробусамі — будучыня, асабліва ў буйных гарадах.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трамп сустрэўся з Кім Чэн Ынам і зайшоў на тэрыторыю КНДР



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп сустрэўся з кіраўніком КНДР Кім Чэн Ынам у дэмілітарызаванай зоне на мяжы Паўднёвай і Паўночнай Карэй. Сустрэча лідараў дзвюх краін у гэтым месяцы адбылася ўпершыню ў гісторыі. Трамп таксама стаў першым прэзідэнтам ЗША, які пабываў на тэрыторыі Паўночнай Карэі. «Рады зноў цябе бачыць», — сказаў Трамп Кім Чэн Ыну. Першапачаткова чакалася, што сустрэча будзе кароткай і абмяжуецца поціскам рукі і невялікім дыялогам. Пасля поціску рукі прэзідэнт ЗША перасек дэмаркацыйную лінію і апынуўся на тэрыторыі КНДР. Ён зрабіў некалькі крокаў, пасля чаго абодва лідары зноў паціснулі адзін аднаму рукі і перайшлі на паўднёвы бок дэмілітарызаванай зоны. Падчас размовы з журналістамі Трамп заявіў, што сімвалічнае перасячэнне мяжы стала для яго «велізарным гонарам». Пасля прэзідэнты адправіліся ў будынак для перагавораў — так званы Дом свабоды — і працягнулі сустрэчу там. Пасля яе завяршэння Дональд Трамп і прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін праводзілі Кім Чэн Ына да дэмаркацыйнай лініі.

### У выніку тэракта ў Кабуле загінулі 34 чалавекі



Радыкальны афганскі рух «Талібан» узяў на сябе адказнасць за тэракт, які здзейснены ў Кабуле. Пра гэта паведаміў тэлеканал TOLONews. Бомба выбухнула ў дыпламатычным квартале афганскай сталіцы. У выніку тэракта па меншай меры 34 чалавекі загінулі і 68 пацярпелі, паведаміла агенцтва Сіньхуа. Параненыя дастаўлены ў бальніцы, з іх дзевяць — дзеці, паведаміў прадстаўнік міністэрства аховы здароўя Вахідула Маяр. Бомба выбухнула ў аўтамабілі каля будынка міністэрства нацыянальнай абароны Афганістана ў гадзіну пік, калі вуліцы былі запоўненыя людзьмі, удакладняе Aljazeera. Прадстаўнік талібаў Забіула Муджахід заявіў, што рух атакаваў «цэнтры лагістыкі і інжынірынгу» Мінабароны. У заяве руху адзначаецца, што магутны выбух прывёў да сур'ёзных страт сярод грамадзянскага насельніцтва, аднак мэтай нападу былі не мірныя жыхары, а вайскоўцы. Месца здарэння ачэплена сіламі бяспекі. Па звестках тэлеканала TOLONews, двое баевікоў, якія маюць дачыненне да тэракта, схаваліся ў адным з будынкаў паблізу месца выбуху і ўступілі ў перастрэлку з сілавікамі.

### Мексіканскі мегаполіс заваліла снегам



Шэсць прыгарадных раёнаў мексіканскага горада Гвадалахара нечакана аказаліся заваленыя тоўстым пластом снегу, паведаміла Бі-бі-сі. У некаторых месцах таўшчыня снежнага покрыва дасягала паўтара метра. Гвадалахара — горад з пяцімільённым насельніцтвам, размешчаны на поўнач ад Мехіка, вышыня над узроўнем мора складае каля 1,5 кіламетра. Мясцовыя ўлады таксама паведамілі аб паваленых дрэвах і паводцы. Пра пацярпелых звестак няма. Некаторыя вуліцы горада былі ператвораны ў рэкі з шчыльным градам, некалькі чалавек прыйшлося ратаваць з дахаў аўтамабіляў. Тэмпература паветра ў горадзе была каля 30 градусаў Цэльсія, калі на Гвадалахару нечакана абрынуўся снегапад. Пашкоджана каля 200 дамоў і мноства аўтамашын. Работнікі надзвычайных службаў і гарадскія служачыя пры садзейнічанні арміі працавалі ўсю ноч і раніцу, каб расчысціць гарадскія дарогі. Губернатар штата назваў тое, што адбылося, незвычайным. «А потым мы пытаем, ці на самай справе адбываюцца глабальныя змены клімату. Такой прыроднай з'явы мы яшчэ не бачылі», — заявіў губернатар.

# ЯРКІЯ ЎСПАМІНЫ Ў СЭРЦЫ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



«Гэта было свята дружбы і яднання, гарачага запалу спаборніцтваў, якія з'ядналі мільёны жыхароў Еўропы ў адну вялікую сям'ю, — адзначыў **Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА.** — Але перш за ўсё мы падарылі яго сабе, беларусам, як сведчанне нашых магчымасцяў і таго, што мы горы можам звярнуць, калі разам. Для гасцей мы шырока расчынілі ўсе дзверы Беларусі — краіны сярэдднееўрапейскіх памераў, што жыве і развіваецца па сваіх законах і традыцыях, якія ідуць з глыбокай даўніны стагоддзяў. Краіны, якая не стварае праблем і не выстаўляе прэтэнзій суседзям. Яны, гэтыя суседзі, у нас вельмі розныя, і ладзіць з імі часам няпроста. На працягу дзесяці дзён на мінскіх арэнах панавала цёплая атмасфера ўзаемапавагі. Яе стваралі ўсе вы — жыхары і госці Беларусі. Усе, хто любіць спорт, верыць у сілу алімпійскай місіі, нацэленай на захаванне міру на зямлі».

У ложы ганаровых гасцей за цырымоніяй закрыцця Еўрапейскіх гульняў у Мінску назіралі разам з Прэзідэнтам Беларусі многія высокапастаўленыя госці, сярод якіх Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон, Прэзідэнт Арменіі Армэн Саркісян, кіраўнік Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах.

У аснову ўрачыстай цырымоніі закрыцця, якой традыцыйна завяршыліся Еўрапейскія гульні, лягло тэатралізаванае шоу «Ідзі за марай». Рэжысёры прысвяцілі яго атлетам і трэнерам, валанцёрам і балельшчыкам, а значыць, усім, хто зрабіў гэтыя дзесяць дзён незабыўнымі. Шоу было падзелена на шэсць эпізодаў: «Перад стартам», «Другое дыханне», «Трэнер», «Павага», «Новы выклік» і «Перамога». Кожны эпізод прысвечаны пэўнай грані спорту, якая раскрылася ў відэароліках на стадыёне і тэатралізаваным прадстаўленні.

Асаблівая ўвага была аддадзена ўшанаванню спартсменаў і валанцёраў. Фінальную песню цырымоніі закрыцця «Time to Say Goodbye» выканалі беларуская оперная спявачка Аксана Волкава і расійскі спявак Мікалай Баскаў. А пад кампазіцыю «Да новых сустрэч» беларускай артысткі Юліі Быкавай быў загашаны факел спартыўнага форуму.

Узровень правядзення турніру ў Мінску ацаніў **прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янез Качыянчыч і старшыня Каардынацыйнай камісіі II Еўрапейскіх гульняў Спірас КАПРАЛАС.**

«Выдатная работа арганізацыйнага камітэта II Еўрапейскіх гульняў, усе пытанні вырашаліся вельмі хутка. Без сумневаў, мы лічым, што Гульні прайшлі на высокім узроўні і пакінулі багатую спадчыну», — сказаў спадар Качыянчыч.

«Апошнія гады мы часта бывалі ў беларускай сталіцы і бачылі работу ўсіх, хто працаваў над Гульнямі. Усе, хто быў задзейнічаны, ішлі да адной мэты. Калі ўдзельнікі спаборніцтваў наведалі Вёску спартсменаў, яны былі ў захапленні! Выдатныя пакоі, выдатная ежа, да транспартнага забеспячэння ніякіх пытанняў, хоць на падобных мерапрыемствах гэта заўсёды адна з самых вялікіх праблем. Ну, зразумела, арэны — усё супер», — падзяліўся Спірас Капралас і падкрэсліў, што ўдзельнікі і госці Гульняў змаглі нацешыцца прыгожым і бяспечным горадам-арганізатарам. Таксама Спірас Капралас анансаваў магчымасць уключэння ў праграму III Еўрапейскіх гульняў, якія пройдуць у польскім Кракаве, відаў спорту, што будуць прадстаўлены на Алімпіядзе ў Парыжы ў 2024 годзе.

**Дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій КАТУЛІН** падзякаваў Спірасу Капраласу за высокую ацэнку работы арганізатараў форуму. «Вельмі прыемна пачуць гэта пасля той работы, якую мы прарабілі ўсёй камандай. Сёння мы гаворым пра тое, што мары сталі рэальнасцю. Калі мы пачалі гэтым займацца два гады таму, мы хацелі стварыць выдатнае спартыўнае мерапрыемства, а таксама прадэманстраваць бізнес і турыстычны патэнцыял Беларусі, — сказаў Георгій Катулін. — Я таксама хацеў бы падзякаваць усёй вялікай камандзе, якая займалася арганізацыяй Гульняў. Думаю, уся наша краіна атрымала зарад натхнення ад гэтай глабальнай спартыўнай падзеі. Мы таксама рады, што атлеты з усіх 50 еўрапейскіх краін прынялі ўдзел у II Еўрапейскіх гульнях. Вялікі дзякуй валанцёрам, без якіх яны былі б немагчымыя. Дзякуй балельшчыкам, якія падтрымлівалі спартсменаў і натхнялі іх на новыя дасягненні. Мы ўсе змаглі ўбачыць, што алімпійскі рух становіцца ўсё мацнейшым».





**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.**

# Свята з ранку да ночы

## Віцебск адзначыў 1045-годдзе

**Першыя мерапрыемствы правялі 26 чэрвеня. Улічваючы, што свята супала з юбілеем вызвалення Беларусі, шмат мерапрыемстваў было прысвечана яму.**



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

**Старшыня Віцебскага гарвыканкама Віктар НІКАЛАЙКІН** на сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай, былымі падпольшчыкамі, працаўнікамі тылу ад імя гараджан падзякаваў за гераізм, якія яны праявілі ў барацьбе з акупантамі. Мэр нагадаў, што ў 1941—1944 гадах у Віцебску дзейнічала пяць лагераў смерці. Там было знішчана, памерла ад хвароб каля 200 тысяч чалавек. Гэта больш, чым было насельніцтва ў горадзе да вайны. Для параўнання, у Віцебску цяпер каля 380 тысяч жыхароў.

У адзін са святочных дзён адбылася вельмі знакавая падзея: адкрыццё памятнага знака, прысвечанага 75-годдзю партызанскага парада ў Віцебску. Яго можна лічыць унікальным, бо, як вядома, такі парад быў яшчэ толькі ў Мінску. **Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** на цырымоніі адкрыцця паведаміў, што робіцца для рамонту і рэканструкцыі на тэрыторыі мемарыялаў і воінскіх пахаванняў, падкрэсліў, што традыцыя ўвекавечваць тое, што звязана з вайной, працягваецца, дзякуючы краязнаўцам, музейным работнікам, пошукавікам.

Сёлета вельмі маштабнай стала рэканструкцыя таго, што адбылося падчас вызвалення горада. Тысячы людзей прыйшлі паглядзець, як актывісты з гурткоў ваеннай рэканструкцыі паказвалі фрагменты бою за горад...

У святочным Віцебску можна было «перанесціся ў часе», убачыць быт савецкіх байцоў пад музыку 1930—1950-х гадоў. Гэта асабліва кранула сэрцы ветэранаў вайны, тых, хто быў маленькі ў тыя гады.

За пяць дзён святкавання арганізатары правялі сотні мерапрыемстваў. І, што цікава, не толькі ў цэнтры горада, але і ў мікрараёнах. Вельмі цікавай была выстаўка рэтра-аўтамабіляў, шмат гараджан прыйшло на свята гарадской газеты «Віцьбічы», інтэрактыўныя пляцоўкі выратавальнікаў, ДАІ.

Арганізавалі і першы адкрыты маладзёжны фестываль харэаграфіі. Шмат гледачоў сабралі спартыўныя мерапрыемствы: кубак горада па пляжным футболе і чэмпіянат па стрытболе, спаборніцтвы па лоўлі рыбы.

Вельмі спадабаліся гараджанам і гасцям горада дэгустацыі і продаж тавараў ад мясцовых вытворцаў.

У рамках праекта «Віцебск турыстычны» адбылася прэзентацыя экскурсійных маршрутаў, якіх, між іншым, з кожным годам становіцца ўсё больш.

Відовішча дапоўнілі госці з Латвіі, якія прывезлі з сабой народнае свята «Ліга».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Надвор'е

# ПОДЫХ ПОЎНАЧЫ

## Нас чакае тыдзень дажджоў і тэмпература днём каля дваццаці цяпла

**У наш бок прыйдзе пахаладанне, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, на гэтым тыдні чакаецца няўстойлівае надвор'е. Першы дзень ліпеня быў гарачы, ужо ў сярэдзіне дня тэмпература паветра ў многіх раёнах краіны перавысіла адзнаку плюс 30 градусаў. Але сёння спякота спадзе, а ў сярэдзіне тыдня на тэрыторыю краіны пачне паступаць больш халоднае паветра з поўначы Еўропы, і тэмпературны фон панізіцца.

Сёння ўдзень у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ад плюс 20 да плюс 26 градусаў. У сераду, пераважна па паўночнай частцы краіны, месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і парывісты вецер. Уначы будзе ад 8 цяпла да плюс 15 градусаў. Тэмпература спадзе і днём: чакаецца ў асноўным ад плюс 15 да плюс 22 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да 24 цяпла.

Не зменіцца надвор'е і ў чацвер. У гэты дзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы будзе ад 6 да 11 градусаў цяпла, удзень — плюс 15—22. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ўначы ў паўночна-заходніх, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Месцамі магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, удзень — 14—21 цяпла, па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 22—26 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО ЎБАЧЫМ НА ПАРАДЗЕ?

**Нагадаем, што ўрачыстае праходжанне войскаў Мінскага гарнізона каля стэлы «Мінск — горад-герой» пачнецца а 21-й гадзіне вечара 3 ліпеня. Завесу таямніцы над тым, што ж убачаць гледачы, прыадкрыў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ:**

— Сёлета парад пачнецца з пралёту авіяцыі ў небе над сталіцай. Людзі ўбачаць сучасныя баявыя самалёты і верталёты ваенна-паветраных сіл Беларусі і ваенна-касмічных войскаў Расіі. У парадным страі перад гледачамі пройдуць 25 пешых парадных разлікаў і 26 разлікаў тэхнікі. Скончыцца святочнае шэсце плац-парадам зводнай роты ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры.

Усяго ў ваенным парадзе прыме ўдзел больш за 5 тысяч вайскоўцаў, а механізаваную калону складуць больш за 280 адзінак колавай і гусенічнай тэхнікі. Што да паветранага эшалона, то ў ім будзе задзейнічана каля 50 самалётаў і верталётаў. Тры сцягі — беларускі дзяржаўны, Узброеных Сіл і войскаў ВПС і ППА — панясуць верталёты Мі-8МТВ5. Праляціць звяно баявых верталётаў Мі-24, ад Расіі возьмуць удзел легендарныя Ка-52. У неба ўздымецца самалёт АН-26 у суправаджэнні двух знішчальнікаў МіГ-29. Будуць і бамбардзіроўшчыкі. Скончыцца ж паветраны парад пралётам самалёта Іл-76 у суправаджэнні пяці вучэбных самалётаў.

Мяркуецца, што ўдзел у парадзе возьмуць вайскоўцы з васьмі замежных дзяржаў. Ужо па традыцыі перад трыбунамі пройдуць ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Расіі і Народна-вызваленчай арміі Кітая. Упершыню плануецца ўдзел сцягавых груп ад Узброеных Сіл Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана.

Шэсце ж пешай калоны ўжо па традыцыі адкрыюць суворашцы. У парадным страі ўпершыню з'явяцца баявыя сцягі партызанскіх фарміраванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Варта звярнуць увагу, што перад стартам аперацыі «Баграціён» на Беларусі дзейнічалі 148 брыгад і 53 асобныя атрады народных мсціўцаў.

Таксама перад трыбунамі пройдуць тры разлікі ваеннаслужачых-жанчын. Два з іх будуць ад Узброеных Сіл і адзін — ад МУС. Прычым летась на парадзе быў усяго адзін жаночы разлік.

Яшчэ адна асаблівасць парада — вялікая колькасць новай або глыбока мадэрнізаванай тэхнікі ў складзе механізаванай калоны. Яна складае прыкладна 70 працэнтаў. І ўжо па традыцыі на чале механізаванай калоны паедзе легендарны савецкі танк Т-34, які стаў сімвалам Вялікай Айчыннай вайны.

Падзея

# ВЫПУСК ВАЕННАЙ ЭЛІТЫ

**Больш за 120 афіцэраў атрымалі ў Палацы Рэспублікі дыпломы аб заканчэнні факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі. Павіншаваць іх прыбыў кіруючы склад сілавых структур краіны.**

— Навучанне на факультэце скончылі не толькі афіцэры Узброеных Сіл, — адзначыў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.** — Сярод іх — і прадстаўнікі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў МУС, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Гэта — надзейная прыкмета таго, што наладжана сістэмнае і выніковае ўзаемадзеянне паміж сілавымі структурамі Беларусі. Выконваючы задачы па ажыццяўленні нацыянальнай бяспекі, мы разумеем адзін аднаго з паўслова.

Тэрмін навучання на факультэце складае паўтара года. Выпускнікам выдаецца дыплом дзяржаўнага ўзору аб вышэйшай адукацыі з прысваеннем кваліфікацыі магістра ў галіне дзяржаўнага і ваеннага кіравання, магістра кіравання.

— Мы выпускаем афіцэраў аператыўна-стратэгічнага і аператыўна-тактычнага ўзроўню, — заўважыў **начальнік факультэта Генеральнага штаба Сяргей ЗАЙЦАЎ.** — Слухачы факультэта вывучаюць такія дысцыпліны, як нацыянальная бяспека, ваенная стратэгія, геапалітыка, аператыўнае майстэрства. Можна сказаць, што яны — ваенная эліта нашай дзяржавы. І больш за два дзясяткі выпускнікоў уганараваны залатымі медалямі.

Змена

# ВАКАЦЫІ Ў ВОЙСКУ

**У чэрвені ў 56-м палку сувязі знаходзілася каля 250 вучняў дзясятых класаў школ Маскоўскага раёна сталіцы. Для іх быў арганізаваны спецыяльны ваенна-патрыятычны лагер. Ён прызначаны для таго, каб замацаваць на практыцы веды, атрыманыя падчас тэарэтычных заняткаў па дапрызыўнай падрыхтоўцы. А заадно — і паказаць войска падлеткам знутры, каб пасля праходжання медыцынскага агляду ў ваенкамаце армія не здавалася terra incognita.**

— Сёлета мы прымаем тры змены з дзённым знаходжаннем на тэрыторыі нашай часці і адну — з кругласутачным, — адзначае **намеснік камандзіра па ідэалагічнай рабоце падпалкоўнік Андрэй ГАНЧАРОЎ.** — Усе змены доўжацца па пяць дзён. Агулам плануем прыняць каля 800 школьнікаў з Маскоўскага раёна сталіцы. Прычым хачу зазначыць, што мы прымаем у сябе не толькі старшакласнікаў. Напрыклад, з 38-й гімназіі, якая размешчана непадалёк адсюль, мы запрашалі і другія, і чацвёртыя, і пятыя класы. Нам неаднаразова тэлефанавалі з розных школ з просьбай паказаць машыны малым. Ды і самі школьнікі гэтым вельмі цікавяцца.

Што ж чакала юнакоў цяпер? Кожны дзень непадобны на папярэдні. Напрыклад, мы паказалі ім тэхніку, якая прыме ўдзел у парадзе 3 ліпеня. Створана і некалькі навучальных пунктаў. Першы з іх абумоўлены нашай спецыфікай. Мы паказваем, як працуе сучасны вузел сувязі. На другім адбываецца агнявая падрыхтоўка. Трэці — прысвечаны аказанню першай медыцынскай дапамогі. Аднак самы захапляльны — апошні. Там мы дэманструем сакрэты выжывання ў экстрэмальных умовах.

Заняткі па гэтай дысцыпліне праводзіць **выкладчык Цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі Маскоўскага раёна падпалкоўнік запасу Ігар БЯДЭНКА.**

— Самае першае пытанне — як здабыць агонь у лесе? Адна справа, калі вы турыст, і зусім іншая — калі вы знаходзіцеся ў разведцы ў баявых умовах. Кожны ваеннаслужачы павінен умець здабыць ваду, без якой доўга не можа абысціся, знайсці ежу і развесці вогнішча, а яшчэ валодаць тэхнікай маскіроўкі. Вось я і пакажу хлопцам, як можна здабыць агонь без запалак і запальнічкі, — кажа Ігар Бядэнка. — Думаю, што гэта павінен умець любы мужчына — хто ведае, куды яго можа закінуць жыццё?

— І гэта ўсё вывучаецца ў межах дапрызыўнай падрыхтоўкі?

— Так. Наогул, гэты прадмет мае на ўвазе маральна-псіхалагічную падрыхтоўку да службы ва Узброеных Сілах. Хочам, каб юнакі «дакрануліся» да войска яшчэ да таго, як ім споўніцца васямнаццаць гадоў і яны пяройдуць у статус прызыўніка. Мы трэніруемся. Хлопцы вучацца разборцы-зборцы аўтамата і паказваюць нядрэнныя вынікі. У нас ёсць цудоўны цір, у якім вучні страляюць з пнеўматычных вінтовак. Таксама яны здаюць нарматывы па апрананні агульнавайсковага абарончага касцюма, надзяванні процівагаза. А яшчэ ў нас ёсць цудоўная традыцыя — мы адзначаем усе ваенныя святы.

Навучанне дапрызыўнай падрыхтоўцы арганізавана па блочна-модульным прынцыпе. Раз на год на працягу шасці дзён старшакласнікі з адной школы займаюцца ў Цэнтры па шэсць урокаў. Новы тыдзень — новая школа. Пасля дзясятага класа вучняў чакаюць невялікія жыццёвыя зборы. Калі яны атрымалі станоўчыя адзнакі — то пераходзяць у адзінаццаты клас, і ўжо там іх чакае яшчэ адзін тыдзень заняткаў па вайсковай справе.

— Тэарэтычныя заняткі таксама праходзяць цікава, — працягвае Ігар Бядэнка. — Мы вывучаем гісторыю, вайсковыя статуты. Школьнікі таксама робяць цікавыя даклады. Напрыклад, аднойчы аказалася, што адзін з вучняў з'яўляецца далёкім сваяком піянера-героя Марата Казея.

Як зазначыў **кіраўнік Цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі Маскоўскага раёна старшы лейтэнант запасу Ігар РУТКОЎСКІ,** цяпер у ім навучаюцца 655 хлопчыкаў і 765 дзяўчынак. Апошнія праходзяць медыцынскую падрыхтоўку ў раённых паліклініках.

— Але быў у нас выпадак, калі дзяўчынка, якая навучалася ў кадэцкім класе, захацела вывучаць менавіта дапрызыўную падрыхтоўку, — успамінае Ігар Рутkоўскі. — Ніякіх перашкод у гэтым не было — мы яе залічылі ва ўзвод, яна атрымала ацэнку ў атэстат па дапрызыўнай падрыхтоўцы. Прычым адзнака была выдатная.

***— Заняткі ў Цэнтры могуць для нейкай школы праходзіць у кастрычніку, а збор будзе толькі ў чэрвені. Ці не забудуць вучні за гэты час тое, чаму навучыліся?***

— Мы ж не спыняемся толькі на тыднёвым навучальным плане. Пастаянна ў нас праходзяць ваенныя спаборніцтвы, гульні... У іх праграму ўваходзіць усё, што яны вывучаюць. Акрамя таго, шмат школьнікаў наведваюць цір, які адкрыўся пасля капітальнага рамонту.





Аляксей Ахрэмчык — без пяці хвілін адзінаццацікласнік, вучыцца ў 209-й сярэдняй школе сталіцы. Пытаюся: наколькі цікава назіраць за работай тэхнікі?

— Тут усё проста заваробжвае, — кажа хлопец. — Гэта ж не звычайная грамадзянская сувязь у выглядзе вышак сотавай, якія ты бачыш штодня. Тут каналы, якія не прызначаны, скажам так, для шырокіх вушэй. Ды і душа да сувязі ляжыць. Цікава ўсё — перадача самога сігналу, тэхнічныя сродкі, якія дазваляюць гэта рабіць... На спецыяльнасць, звязаную з сувяззю, хачу паступіць пасля школы ў БДУІР. І ўжо сур'ёзна да гэтага рыхтуюся.



выкладаем страявую падрыхтоўку — яна дапамагае арганізаваць калектыў. Расказваем пра элементы тактычнай падрыхтоўкі падчас наступу і абароны. Займаемся са школьнікамі і ваеннай тапаграфіяй — гэта арыентаванне на мясцовасці. Канешне ж, ёсць у нас і агнявая падрыхтоўка. Міністэрства абароны перадало нам макеты аўтаматаў, з дапамогай якіх

**Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Пошук

# ВАХТА ПАМЯЦІ НА 25 ГАДОЎ

**Гэтыя людзі ўвесь час жывуць падзеямі ваенных часоў, бо лічаць сваім абавязкам знайсці і перапахаваць усіх салдат, зніклых у тым жахлівым крывавым пекле амаль бясследна — без вестак. І яны іх шукаюць, шукаюць вось ужо 25 гадоў. За час свайго існавання Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру» сумесна з 52-м пошукавым батальёнам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь падняў і ўрачыста перапахаваў астанкі 1201 чалавека, 79 з якіх вярнуў імёны.**




## СА ШЧУПАМ І РЫДЛЁЎКАЙ

— Першая наша Вахта Памяці прайшла ў Круглянскім раёне, дзе мы разам з «мабілізаванымі» ўпраўленнем адукацыі аблвыканкама школьнікамі і студэнтамі шукалі сляды зніклых без вестак чырвонаармейцаў і партызан брыгады «Чэкіст» — яны загінулі ў начным баі 29 чэрвеня 1944 года, — згадвае **кіраўнік абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА.** — На ўзбраенні ў нас тады былі толькі прымітыўны металічны шчуп і вялікая сапёрная рыдлёўка. Як жа мы радаваліся, калі атрымалася высветліць першыя імёны гэтых байцоў! Потым было яшчэ шмат знаходак, але тыя пачуцці вельмі моцна ўрэзаліся ў памяць. Бо былі першыя.

На рахунку клуба шматлікія экспедыцыі па пошуку абаронцаў Магілёва на месцах жорсткіх баёў у вёсках Благавічы, Удоўск, Самулкі, на рацэ Проня ў Чавускім раёне, вялікая даследчая работа, звязаная з будаўніцтвам мемарыяла на Буйніцкім полі, экспедыцыі ў Клічаўскі, Быхаўскі і Кіраўскі раёны, дзе ў глухіх лясах і балотах ляжалі з часоў вайны збітыя савецкія самалёты, а іх экіпажы лічыліся зніклымі без вестак. І вялікай узнагародай за гэтыя гадзіны, дні, месяцы, гады пошукаў былі знойдзеная ў зямлі пражавелая амуніцыя, астанкі байцоў і — неверагодная ўдача! — асабістыя медальёны. Кавалачкі металу, якія, быццам душа салдата, зберагалі яго імя. Шкада, што яны, як і іншыя прадметы, якія нешта расказваюць пра сваіх уладальнікаў, трапляюць у рукі не так часта.

## МАЛА ЗНАЙСЦІ...

За апошнія гады «віккруўцамі» ўстаноўлены імёны і лёсы экіпажаў пяці савецкіх самалётаў, зніклых без вестак на тэрыторыі вобласці.

— Наша задача не толькі знайсці загінулых, але і ўвекавечыць іх, — кажа Мікалай Барысенка. — На месцы падзення гэтага Іл-4 у будучым абавязкова ўстановіць памятны знак. Па нашай ініцыятыве ў Магілёве з'явіліся вуліцы з прозвішчамі герояў абароны Магілёва — Рыгора Златаўстоўскага, Мікалая Цярохіна і Якава Слепакурава. З нашай падачы і пры фінансавай падтрымцы выканкамаў на тэрыторыі вобласці з'явіліся 32 помнікі і мемарыяльныя знакі воінам Чырвонай Арміі, лётчыкам і партызанам.

Асаблівы гонар пошукавікі адчуваюць за помнікі, якія сёння стаяць на месцы жорсткіх баёў — на рацэ Проня каля вёскі Пуцькі ў Чавускім раёне, непадалёк ад вёскі Самулкі (воінам 61-га стралковага і 20-га механізаванага карпусоў), каля вёскі Следзюкі Быхаўскага раёна (на месцы баёў 187-й стралковай дывізіі), у раёне вёсак Брускі — Буйнічы Магілёўскага раёна, дзе выходзілі з акружэння апошнія байцы легендарнай 172-й стралковай дывізіі генерала Раманава, якая 23 дні трымала абарону Магілёва.



**Дзейнасць клуба ў кнігах і фота.**

А яшчэ дзякуючы «віккруўцам» летась на рацэ Проня з'явіўся першы ў Беларусі памятны знак савецкім штрафным падраздзяленням, якія па-геройску змагаліся тут у 1943—1944 гадах. Гэта была сумесная акцыя пошукавікаў клуба і Чавускага райвыканкама.

«Віккруўцы» ведаюць, як гэта важна — захаваць тыя здабыткі, якія зроблены падчас іх тытанічнай работы. Яны прымалі актыўны ўдзел у здымках мастацкіх фільмаў «Дняпроўскі рубеж», «Брэсцкая крэпасць», «Сталінград», удзельнічалі ў напісанні сцэнарыяў і здымках 10 дакументальных фільмаў на ваенна-гістарычную тэматыку. Сумесна з галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама і пры падтрымцы абласнога цэнтра творчасці клуб выпускае адзіны ў Беларусі ваенна-гістарычны зборнік «Магілёўскі пошукавы веснік». Уся гэтая дзейнасць клуба выклікае ў грамадстве вялікі рэзананс, зацікаўлівае моладзь. Хлопцы і дзяўчаты дапамагаюць шукаць зніклых без вестак на пошукавых сайтах, удзельнічаюць у раскопках на месцах баёў — на канкрэтных справах і прыкладах становяцца сапраўднымі патрыётамі Беларусі, разумеюць, што значыць абараняць радзіму і аддаваць за яе жыццё.

## ТЫЯ, ХТО ВЯРТАЕ ГЕРОЯМ ІМЁНЫ

Беражліва трымаю ў руках кавалачак халоднага металу з надпісам «За актыўны пошук» і адчуваю неверагодны гонар і адказнасць. Гэты ганаровы знак Міністэрства абароны я атрымала на юбілейным мерапрыемстве «віккруўцаў» з рук **начальніка ўпраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Сяргея ВАРАНОВІЧА.** Павіншаваць віноўнікаў свята прыйшлі прадстаўнікі гар- і аблвыканкама, сілавых ведамстваў. Са словамі ўдзячнасці да прысутных звярнуўся **старшыня аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ,** плёну і поспеху ў нялёгкай справе пажадаў **старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦУМАРАЎ.** Пошукавікі атрымалі ўзнагароды, ганаровыя граматы, падзякі розных узроўняў, каштоўныя падарункі. У іх гонар быў дадзены канцэрт. Сёння клуб «Віккру» — гэта адданне аб'яднанне ў краіне, у яго ўваходзяць 20 маладзёжных пошукавых атрадаў і груп у 14 раёнах вобласці з агульнай колькасцю каля 100 чалавек.

## НА ГОЛЫМ ЭНТУЗІЯЗМЕ

Унікальнасць клуба яшчэ і ў тым, што існуе ён у асноўным за свой жа кошт. Уся работа вядзецца на грамадскіх пачатках, перад кожнай экспедыцыяй хлопцы збіраюць грошы на харчаванне і паліва, за ўласны кошт набываюць дарагую амуніцыю і абсталяванне. Сёлета пры клубе «Віккру» быў створаны разліковы рахунак, куды пачалі паступаць невялікія ахвяраванні ад грамадзян і некаторых устаноў. Матэрыяльная падтрымка вельмі важная для дзейнасці клуба, моцна павышае эфектыўнасць яго работы. Дастаткова прывесці прыклад. Сёлета аблвыканкам набыў нямецкія трафейныя аэрафотаздымкі месцаў баёў, дзякуючы якім упершыню на месцы баёў батальёна Уладзімірава за некалькі дзён вахты былі паднятыя астанкі 23 байцоў. Для параўнання: летась тут атрымалася знайсці толькі аднаго чырвонаармейца. Усяго за тры сёлетнія пошукавыя экспедыцыі ў Быхаўскім, Слаўгарадскім і Магілёўскім раёнах знойдзены астанкі 51 воіна Чырвонай Арміі і ўстаноўлены імёны траіх. Ужо атрымалася выйсці на сувязь са сваякамі загінулых.

## ЧЫМ ДАПАМАГЧЫ?

Калі вам неабыякавы лёс тых, хто наблізіў Перамогу, не вярнуўся з бою і каго цяпер трэба знайсці, ёсць магчымасць падтрымаць пошукавую дзейнасць. Рэквізіты дабрачыннага рахунка клуба «Віккру»: № BY91 AKBB 3015 0427 4730 8700 0000 у філіяле № 700, МАУ ААТ «ААБ Беларусбанк», МФО AKBBBY21700, УНП 790612863, 212030, Рэспубліка Беларусь, г. Магілёў, завулак Пажарны, 7. Кантактныя тэлефоны: + 375-29-645-67-97 (velcom); 8 (0222) 42-17-97. Грамадскае аб'яднанне «Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру».

Ваша дапамога зможа значна наблізіць той дзень, калі вернецца памяць пра чарговую зніклую без вестак ахвяру вайны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

Стала вядома

# Час тэрміновай службы ўключаць у страхавы стаж?

**Міністэрства абароны таксама працуе і над тым, каб даваць іншыя прэферэнцыі тым, хто адслужыў у войску. Пра гэта паведамілі ў ведамстве.**

«Прапанова Міністэрства абароны пра залік тэрміну службы ў страхавы пенсійны стаж падтрымана большасцю дзяржаўных органаў. Нягледзячы на тое што асобныя органы дзяржаўнага кіравання пакуль не ўзгаднілі гэтую норму, ваеннае ведамства абавязкова правядзе ў жыццё прапановы па павышэнні сацыяльнага статусу салдата», — адзначылі ў Мінабароны.

Комплекс мер па павышэнні статусу ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і службы ў рэзерве распрацаваны ў Мінабароны ў 2016 годзе. Ён паслядоўна рэалізуецца. Напрыклад, з пачатку гэтага года больш чым у два разы павялічана грашовае забеспячэнне тэрміновай службы і рэзервістаў.

Мяркуецца, што ў студзені 2020 года ўступіць у сілу закон, згодна з якім першачарговае права на атрыманне месца ў інтэрнаце будзе дадзена навучэнцам, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу ці службу ў рэзерве, — тым, у каго ёсць рэкамендацыі воінскіх часцей.

Зараз разглядаецца пытанне аб даванні льгот і пры працаўладкаванні. Напрыклад, гэта датычыцца захавання права вярнуцца на ранейшае месца работы на працягу трох месяцаў з дня заканчэння ваеннай службы.

Атрымала падтрымку даванне пераважнага права на залічэнне ў ВНУ і ССНУ тым, хто адслужыў. Плануецца, што хлопцы з вопытам вайсковай службы змогуць бясплатна навучацца за кошт дзяржавы на падрыхтоўчых аддзяленнях ВНУ.

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки»,<br>г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Автокомбинат № 6», 220029, г. Минск,<br>пер. Физкультурный, 22 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка»,<br>г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение — г. Минск, пер. Физкультурный, д. 22**

| № лот | Наименование |
|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ 31105 (рег. знак 9948 ЕХ-7) — 686,00 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45611) — 29,17 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 715,17**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 35,76) |
| 2 | Автомобиль ЗИЛ ММЗ 45085 (рег. знак КЕ 8760) – 1 820,00 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45615) — 29,17 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 1 849,17**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 92,46) |
| 3 | Автомобиль МАЗ 5516 А5-371 (рег. знак АЕ 8258-7) – 15 190,00 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45614) — 29,17 бел. руб.<br>беседка для курения, 2008 (инв. № 50560) – 175,00 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 15 394,17**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 769,71) |
| 4 | Автомобиль МАЗ 5516 А5-371 (рег. знак АЕ 8259-7) – 10 850,00 бел. руб.<br>устройство дист. Монитор. Моб. Объект «Агент В-602», 2015 г. (инв. № 45616) – 29,17 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45602) – 29,17 бел. руб.<br>Кнопка тревожной сигнализации, 2011 г. (инв. № 52643) — 35,00 бел. руб.<br>Дымомер Мета-01МП 0.1, 2012 г (инв. № 99203) – 151,67 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 11 095,01**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 554,75) |
| 5 | Автомобиль MAZ 551605-271 (рег. знак АМ 9757-7) – 18 970,00 бел. руб.<br>гайковерт Г32*33 мм (инв. № П00001297) – 68,25 бел. руб.<br>аккумулятор 6 СТ 190 (инв. № П00000608) – 137,06 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45601) – 29,17 бел. руб.<br>Трансформатор сварочный ТДМ-50, 1989 (инв. № 10970) — 70,00 бел. руб.<br>стол для диспечерской (инв. № М00001300) – 11,69 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 19 286,17**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 964,31) |
| 6 | Автомобиль MAZ 551605-271 (рег. знак АК 5301-7) – 15 820,00 бел. руб.<br>принтер HP-LaserJet 1200», 2003 (инв. № 40380) — 7,00 бел. руб.<br>устройство дист. Монитор. Моб. Объект «Агент В-602», 2015 г. (инв. № 45617) – 29,17 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45605) – 29,17 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 15 885,24**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 794,26) |
| 7 | Автомобиль MAZ 551605 271 (рег. знак AI 5035-7) – 10 850,00 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45607) – 29,17 бел. руб.<br>Система пожарно-охранной сигнализации, 2005 г. (инв. № 52652) — 70,00 бел. руб.<br>Трансформатор сварочный ТДМ-401,1990 г. (инв. № 10988) — 70,00 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 11 019,17**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 550,96) |
| 8 | Автомобиль MAZ 5516A5 (рег. знак АМ 6732-7) – 10 850,00 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45613) – 29,17 бел. руб.<br>домкрат бутылочный 20 т (инв. № М00002036) – 11,69 бел. руб.<br>стропы (инв. № 8700511) – 11,69 бел. руб.<br>шлагбаум WIL4/A, 2012 г (инв. № 99209) — 210,00 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 11 112,55**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 555,63) |
| 9 | Автомобиль MAZ 6501A5-370-001 (рег. знак АМ 2357-7) – 20 440,00 бел. руб.<br>устройство дист. Монитор. Моб. Объект «Агент В-602», 2015 г. (инв. № 45619) – 29,17 бел. руб.<br>стул «Юпитер» (инв. № 99259) – 29,19 бел. руб.<br>пневмогайковерт (инв. № М00009410) – 105,00 бел. руб.<br>Счетчик жидкого топлива для котельной VZO-15 RC130/16,201 (инв. № 52535) – 70,00 бел. руб.<br>конвектор Термия ЭВНА 2,5/230 (инв. № П00001455) – 42,77 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 20 716,13**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 1035,81) |
| 10 | Автомобиль MAZ 6501 B5-480-001 (рег. знак АМ 2356-7) – 20 440,00 бел. руб.<br>электроталь ТЭ-0.25-311, 1990 г (инв. № 22489) — 700,00 бел. руб.<br>устройство дист. Монитор. Моб. Объект «Агент В-602», 2015 г. (инв. № 45618) – 29,17 бел. руб.<br>навигационный контроллер «SAT-LITE-2» (инв. № 45606) – 29,17 бел. руб.<br>устройство дист. Монитор. Моб. Объект «Агент В-602», 2015 г. (инв. № 45620) – 29,17 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 21 227,51**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 1061,38) |
| 11 | Автомобиль MAZ 6501 B5-480-001 (рег. знак АН 0809-7) – 20 440,00 бел. руб.<br>DVD-проигрыватель «Витязь» (инв. № М0001901) – 11,69 бел. руб.<br>ударная головка 71415132 (инв. № М00009384) – 20,44 бел. руб.<br>ударная головка 71415130 (инв. № М00009386) – 20,44 бел. руб. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 20 492,57**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 1024,63) |
| 12 | Грузовой специальный самосвал MAZ 551605-271, рег. знак АК 5296-7, 2011 г. в. |
| | **Итого начальная цена без НДС – 28 260,00**<br>(Шаг аукциона, бел. руб. без НДС – 1413,00) |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, Валюкевич Владимир Аркадьевич, контактный телефон +37529 623 22 96

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи: | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов. Покупатель дополнительно оплачивает Продавцу стоимость публикаций извещений и стоимость топлива (остаток)

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов по лотам №№ 1—11 опубликовано в газете «Звязда» 04.06.2019 г., по лоту № 12 в газете «Звязда» 15.05.2019 г.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 19.07.2019** в 11.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация):**
**17.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Отдых-2010», расположенного по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, 23, вблизи д. Волма**

**Лот № 1, состав:** 1. Административное здание, инв. № 614/С-23465, площадь — 105,8 кв. м. 2. Гостевой домик № 1, инв. № 614/С-41796, площадь — 74,8 кв. м. 3. Гостевой домик № 2, инв. № 614/С-42046, площадь — 75,7 кв. м. 4. Гостевой домик № 3, инв. № 614/С-42050, площадь — 76,3 кв. м. 5. Гостевой домик № 4, инв. № 614/С-42051, площадь — 117,3 кв. м. 6. Здание КПП, инв. № 614/С-23933, площадь — 40,7 кв. м. 7. Физкультурно-оздоровительный комплекс, инв. № 614/С-23462, площадь — 350,8 кв. м. 8. Овощехранилище, инв. № 614/С-23936, площадь — 110,5 кв. м. 9. Столовая, инв. № 614/С-23469, площадь – 698 кв. м. 10. Радиоузел, инв. № 614/С-23932, площадь — 11,4 кв. м. 11. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46148, площадь — 1370,6 кв. м. 12. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46146, площадь — 787,5 кв. м. 13. Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 614/U-46147, площадь — 799,1 кв. м. 14. Здание туалета, инв. № 614/С-46183, площадь — 14,1 кв. м. 15. Электрощитовая, инв. № 614/С-46182, площадь — 8,2 кв. м. 16. Артезианская скважина, инв. № 614/С-23466, площадь – 71 кв. м. 17. Водонапорная башня, инв. № 614/С-23939, объем 25 куб. м. 18. Сеть водоснабжения, инв. № 614/С-23937, площадь — 1303,2 кв. м. 19. Сеть кананализации, инв. № 614/С-23940, площадь — 1213,9 кв. м. 20. Тепловая сеть, инв. № 614/С-23938, протяженность 375,7 м. 21. Газопроводы высокого и низкого давления, инв. № 614/С-46057, протяженность 515,6 м. 22. Телефонная канализация, инв. № 614/С-46224, площадь — 11,2 кв. м. 23. Прочее имущество (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by).
**Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости №№ 1—22** площадью 6,0528 га с кадастровым номером 624800000001000405. Право постоянного пользования. **Земельные участки для обслуживания объекта недвижимости № 19:** 1. Площадь 0,0049 га, кадастровый номер 624800000001005031. 2. Площадью 0,1302 га, кадастровый номер 624800000001005032. 3. Площадь 0,0001 га, с кадастровй номер 624800000001005033. Право постоянного пользования. 4. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005034. 5. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005035. 6. Площадь 0,0001 га, кадастровый номер 624800000001005036. 7. Площадь 0,0027 га, кадастровый номер 624800000001005037. 8. Площадь 0,1324 га, кадастровый номер 624800000001005038. Право постоянного пользования. **Начальная цена** – 4 990 599,29 бел. руб с НДС. **Задаток** – 500 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %

**Условия аукциона:** 1. Заключить договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

**Аукцион состоится 02.08.2019 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ЗАО «Отдых-2010», ДОЛ «Заря», р-н д. Волма, 222224 Смолевичский р-н, Минская область, 8 (01776) 2-12-86. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 02.08.2019 (ЗАО «Отдых-2010», Лот № 1).
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений — 31.07.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Контактное лицо для осмотра Объекта — Ядрищенский Дмитрий Владимирович 8(029) 314-71-74

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**сообщает о проведении 17.07.2019 повторного открытого аукциона**

**Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 700/С-9525 – Аккумуляторное отделение,** площадь – 143,5 кв. м; расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007139 (площадь 0,1174 га, право постоянного пользования) по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/5. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание аккумуляторного отделения с асфальтобетонным покрытием.

***Начальная цена продажи: 29 640,00 бел. рублей с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 2 964,00 бел. руб.***

**Лот № 2: Капитальное строение с инв. № 700/С–9533** — Мастерская зоны ТО-2, площадь — 1723,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007140 (право постоянного пользования, площадь 0,6825 га), по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/6. Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное здание мастерской зоны ТО-2 с асфальтобетонным покрытием. **Капитальное строение с инв. № 700/С–12467**, площадь — 23,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007141 (право постоянного пользования, площадь 0,0974 га), по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172/7. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание бензохранилища с асфальтобетонным покрытием, бетонным покрытием, покрытием из тротуарной плитки, двумя подпорными стенами, двумя резервуарами РГДП-25 (инв. №№ 100203, 100204).

**Начальная цена продажи: 395 016,00 бел. рублей с учетом НДС**
**Сумма задатка: 39 501,60 бел. руб.**

**Аукцион состоится 17 июля 2019 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 16.07.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для перечисления задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 12.03.2019 и 15.05.2019

**Организатор аукциона**: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Дополнительную информацию можно получить **по тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25, на сайте ino.by**

Частное торговое унитарное предприятие «Добрый день Плюс», регистрационный № 191357439, реорганизуется в форме преобразования в общество с ограниченной ответственностью. Претензии кредиторов принимаются по адресу: ул. Лещинского, д. 8/4-1, к. 426, 220140, г. Минск.

## ОАО «Крупский плодоовощной завод» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

**Таблица № 1 — Лот № 1**

Капитальное строение с инвентарным № 613/С-10556, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2, площадь — 1 598,1 м², назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание хранилища техники

Земельный участок площадью 5,6931 га с кадастровым номером 623050100001002292. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Право аренды — по 01.10.2102. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

*В отношении вышеуказанного имущества проводятся восьмые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 01.03.2019 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 80 %. Окончание приема заявлений в 18.00 11.07.2019*

| | |
|---|---|
| Начальная цена Лота с НДС 20 % | 25 440,00 белорусских рублей |

**Таблица №2**

| № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % | № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10558 (здание склада-арочника № 1), площадь 490 м² | 20 880,00 | 10 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13482 (погреб), площадь 47,4 м² | 1 740,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10559 (здание склада-арочника № 2), площадь 490 м² | 20 880,00 | 11 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13484 (гараж на 4 бокса), площадь 119,5 м² | 4 860,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13481 (здание кисельного и горчичного цеха), площадь 813,6 м² | 32 880,00 | 12 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13483 (гараж на 2 бокса), площадь 46,2 м² | 1 980,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13480 (проходная), площадь 54,1 м² | 8 640,00 | 13 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13560 (водонапорная башня), площадь 35,3 м² | 2 100,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13527 (здание цеха безалкогольных напитков), площадь 416,2 м² | 26 340,00 | 14 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13478 (здания мастерских), площадь 169,8 м² | 7 680,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13528 (здание цеха по переработке яблок), площадь 249,2 м² | 10 620,00 | 15 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13479 (спиртохранилище), площадь 104,4 м² | 4 740,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13526 (здание цеха для брожения вина), площадь 157,7 м² | 10 140,00 | 16 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10557 (здание склада материальных ценностей), площадь 250 м² | 5 340,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13477 (производственный корпус), площадь 201,6 м² | 12 780,00 | 17 | Сооружение с инв. № 450201 (забор ж/бетонный) | 330,00 |
| 9 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13485 (котельная), площадь 199,9 м² | 15 540,00 | 18 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13559 (артезианская скважина) | 2 940,00 |

*В отношении имущества в таблице № 2 проводятся пятые повторные торги. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственный базы на праве аренды до 2102 года.*
*Публикация об аукционе ранее размещалась 01.03.2019 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 50 %. Окончание приема заявлений в 18.00 11.07.2019.*

| | |
|---|---|
| Задаток | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Организатор торгов | ООО «Фрондера», +375 29 305 86 50 |
| Информация о продавце | ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», тел. +375 29 304-59-90). |
| Дата и время проведения торгов | **15 июля 2019 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 |

Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121

| | |
|---|---|
| Условия для участия в торгах | 1. До подачи заявления внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах.<br>2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah.<br>3. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.<br>4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: +375 29 304-59-90 |

# «ДЛЯ НАС ВАЙНА НАРЭШЦЕ СКОНЧЫЛАСЯ...»

## Праз семдзесят сем гадоў людзі даведаліся пра лёс сваіх блізкіх дзякуючы публікацыі «Звязды»

**Канцлагер Дахау працягвае шукаць сваякоў ахвяр, якія загінулі ў 1941—1942 гадах на стрэльбішчы СС Хебертсхаўзен. Збіраючы гісторыі, вывучаючы лёсы, супрацоўнікі мемарыяла і гісторыкі такім чынам спрабуюць паказаць горкі вопыт чалавецтва, на які нельга забывацца. Калі «Звязда» надрукавала спіс салдат і афіцэраў, якія былі «адабраны» ў лагерах для ваеннапалонных і дастаўлены ў канцлагер Дахау для знішчэння, на публікацыю пачалі адгукацца людзі. Днямі дзве сям'і вярнуліся з Германіі. Яны наведалі месцы, дзе загінулі іх родныя, сталі ўдзельнікамі памятных мерапрыемстваў на былым расстрэльным полі.**



### Месца імёнаў

Мемарыял на былым стрэльбішчы СС адкрыты ў 2014 годзе. Інфармацыйныя стэнды, размешчаныя на ім, расказваюць пра жахлівыя злачынствы, што адбываліся тут у пачатку Другой сусветнай вайны. Згодна з так званым «Загадам аб камісарах» палонных афіцэраў, камуністаў, яўрэяў належала адразу расстрэльваць. Некалькі тысяч палітрукоў (у тым ліку асоб, якіх прымалі за такіх) было расстраляна ўжо ў пачатку вайны з Савецкім Саюзам. Вялікая колькасць ваеннапалонных гінула ў лагерах ад голаду і хвароб. Нацысты пазбаўляліся ад «небяспечных элементаў». Вермахт, тайная дзяржаўная паліцыя (гестапа) і СС дамовіліся пераправяраць усіх савецкіх ваеннапалонных. З лета 1941 года айнзацкаманды гестапа ўзяліся за допыты вязняў. У першую чаргу імкнуліся выявіць камуністаў, інтэлігентаў, яўрэяў. У выніку такога адбору больш за чатыры тысячы ваеннапалонных былі накіраваны ў Дахау і расстраляны на палігоне Хебертсхаўзен.




Ён быў створаны ў 1937—1938 гадах, выкарыстоўваўся для ваеннай падрыхтоўкі асобавага складу СС і іншых арганізацый. На яго тэрыторыі знаходзілася пяць доўгіх ірвоў для навучання стральбе з вінтовак, два стрэльбішчы для стральбы з кулямётаў і пісталетаў, месца для вучэбнага кідання гранат.

Цяпер у цэнтры на спецыяльных платформах таблічкі, на якіх пазначаны прозвішчы забітых тут ваеннапалонных, даты іх нараджэння і год гібелі. Падчас памятных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 78-й гадавіны нападу Германіі на Савецкі Саюз, у экспазіцыю было дададзена некалькі пліт з сотняй вернутых прозвішчаў, таксама былі адкрыты тры новыя стэнды з біяграфіямі асобных ахвяр. На мерапрыемствы былі запрошаны сваякі ахвяр з Расіі, Украіны, Казахстана і Беларусі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і консульскіх карпусоў. Нашы сем'і паклалі кветкі побач з прозвішчамі двух беларусаў — Аркадзя Фаміча Галубка і Івана Емяльянавіча Цішкевіча. Пасля вяртання ў Беларусь сем'і завіталі ў рэдакцыю, каб падзяліцца ўражаннямі.

Эліна Леўчанка дастае фотаздымак, зроблены яшчэ да вайны, — на ім яе дзядуля Васіль і яго брат Іван. Іван тады толькі закончыў ваеннае вучылішча. Завітаў да родных і даў прымераць Васілю сваю форму. Васіль вельмі хацеў пайсці служыць, але яго не бралі праз праблемы зроку. Так і заспеў братоў Цішкевічаў фатограф — Івана ў цывільным адзенні, а Васіля ў ваенным.

У хуткім часе пасля заканчэння вучылішча Іван ажаніўся. У яго нарадзілася трое дзетак (дачка памерла маленькай, адзін з сыноў пасля вайны падарваўся на міне). Калі пачалася вайна, Івану Цішкевічу быў 31 год, ён ужо атрымаў ордэн «Чырвонага сцяга». Ва ўзнагародным лісце пазначана, што капітан Цішкевіч «забяспечыў дакладную работу штаба. Падчас баёў 22.6.41 неаднаразова вадзіў полк у атаку пры выхадзе з акружэння ў раёне Казлова-Руда».



— Мая маці Валянціна Васілеўна вельмі хацела даведацца больш пра лёс сваіх продкаў. Казалі, што бабуля атрымлівала два лісты. Паводле аднаго, Іван трапіў у акружэнне і загінуў, паводле другога — трапіў у палон. Казалі нават, што яго бачылі землякі з Грэску і што нехта выдаў немцам, што Іван камуніст. У 70-х мы даведаліся, што яго полк стаяў пад Каўнасам і што на адкрытай там стэле ёсць ягонае прозвішча... На жаль, у нас амаль ніякіх дакументаў не засталося. Бабуля і дзядуля Васіль разышліся пасля вайны, з сям'ёй Івана сувязі перарваліся, мы хочам адшукаць сваіх родных, — расказвае Эліна Леўчанка. Да пошукаў падключыліся яе сын і нявестка Марыя Коханава. І нарэшце доўгія пошукі далі плён. Сваякі даведаліся, які лёс выпаў Івану Цішкевічу. 1 ліпеня 1941 года капітан аказаўся ў палоне. У жніўні 41-га яго забралі СС, у лютым 42-га прывезлі на стрэльбішча...

— Нам паказалі два крэматорыі (другі быў пабудаваны, бо магутнасцяў першага недастаткова, вельмі многа было ахвяр)... Ваеннапалонных пасля расстрэлу спальвалі, — расказвае пра пачутае і ўбачанае на экскурсіях у Дахау Марыя Коханава. — Да 1965 года пра масавыя забойствы савецкіх ваеннапалонных, што адбываліся за два кіламетры ад канцлагера Дахау, не гаварылі. Мясцовыя жыхары нават казалі, што не ведалі, што адбывалася на стрэльбішчы. А ваеннапалонных туды з вакзала гналі бягом праз увесь горад. На былым вучэбным стрэльбішчы на зняволеных вучыліся страляць, людзей забівалі не адразу, а маглі спачатку прастрэліць нагу, руку. На бетонных сценах там засталіся сляды ад куль... Людзей прымушалі распранацца дагала, прыкоўвалі да слупоў наручнікамі. Спачатку трупы ў крэматорый вывозілі ў цынкавых трунах. А пасля, калі колькасць ахвяр вырасла, проста скідалі ў машыну, якую пасля адмывалі ад крыві. Рэчы забітых адпраўлялі на дэзінфекцыю...

Пасля вайны ў гаспадарчым будынку, што побач са стрэльбішчам, размясціліся бежанцы, а пасля ён выкарыстоўваўся як прытулак для бяздомных. Здавалася, што зладзеям удалося схаваць такое злачынства. Але вязні Дахау і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый працягвалі казаць пра тое, што тут адбываліся жахлівыя рэчы. Падчас раскопак былі знойдзены фрагменты костак і наручнікі, якімі прыкоўвалі ахвяр. Былі сабраны паказанні сведак, асобныя з іх сёння можна пабачыць у экспазіцыі на інфармацыйных стэндах, размешчаных на тэрыторыі «Мемарыяла ахвярам расстрэлаў». Напрыклад, відавочца Антон Хофер, старшы па рэчавым складзе, згадваў: «Расстрэльныя каманды па вечарах пасля расстрэлаў атрымлівалі прэміі ў выглядзе шнапсу, піва і цыгарэт. Акрамя таго іх узнагароджвалі крыжамі ваенных заслуг. Летам 1942 года асабовы склад расстрэльных камандаў правёў чарговы адпачынак у Італіі». Для «рэлаксацыі» расстрэльнай камандзе недалёка ад Дахау была створана нават спецыяльная зона адпачынку з заапаркам. Відаць, для таго, каб людзі не звар'яцелі пасля ўчыненых злачынстваў...

— Мяне ўразіла, што канцлагер Дахау на працягу года наведвае больш за мільён чалавек з усяго свету. Як многа прыязджае замежнікаў, шануюць памяць сваіх блізкіх! Калі трапляеш у такое месца, зусім па-іншаму ўспрымаеш ваенную гісторыю. Мы жывём, атрымліваем асалоду ад жыцця, хвалюемся за нейкую драбязу накшталт дажджу, што раптоўна нас заспеў... А калі стаялі там на вакзале, разумелі, што сюды, няхай і 75 гадоў назад, прыганялі людзей. Ахвяры былі ў найскладанейшых умовах, басанож у зімовыя маразы. Іх прымушалі бегчы некалькі кіламетраў насустрач смерці. Тут асаблівае месца, шыкоўная прырода, спяваюць птушкі і ўражвае кантраст — побач з месцамі забойстваў расліннасць асабліва буйная, сакавітая, яскравая. Попел зрабіў сваю справу. Нам расказвалі, што яго з крэматорыя рассейвалі як угнаенне. Гэта жахліва, і калі не пабываць у такіх месцах, гэтага не адчуць, — дзеліцца Эліна Леўчанка. — Можа, яно і добра, што бабуля тады не даведалася, як загінуў Іван. Куды лягчэй перажыць проста хуткую смерць, чым тое, што з чалавека спачатку доўга здзекваліся, катавалі...

### Трагічныя веды лепшыя за няведанне

Не менш моцнае ўражанне паездка ў Дахау аказала і на сваякоў Аркадзя Фаміча Галубка.

— Я не ведала, што Дахау — горад вельмі прыгожы, утульны, побач з Мюнхенам. І самі жыхары, з кім я пагутарыла, кажуць, што ім шкада, што Дахау асацыююць з такім жахлівым месцам, — дзеліцца Дар'я Паляўцова. — Калі мы знаходзіліся на стрэльбішчы, была адкрыта афіцыйная частка мерапрыемства. Нам расказалі, што там адбывалася... Там ігралі папуры з народных песень... А я ўявіла слупы, да якіх прывязвалі людзей, якія ведалі, што іх будуць расстрэльваць... Мяне страсянула, я расплакалася, стрымлівалася, каб рэальна не завыць... Вельмі страшна ўяўляць, што там нізашто людзей расстрэльвалі, на іх вучыліся, што гэта былі жывыя мішэні...

Пошукам хоць якой інфармацыі пра лёс Аркадзя Галубка займалася не адно пакаленне. Жонка, дачка, пляменнік, унукі пісалі лісты ў розныя інстанцыі (нават у Крэмль), дзяліліся адно з адным сабранай інфармацыяй. Захаваліся даведкі, якія атрымлівалі родныя пасля вайны, асобныя дакументы, звязаныя з Аркадзем Фамічом. Даведацца, як загінуў тэхнік-інтэндант Галубок, змагла яго праўнучка.

— Мае пошукі пачаліся, калі напярэдадні аднаго з Дзён Перамогі мы глядзелі кіно пра вайну, а маці сказала, што ёй вельмі хацелася б хоць што-небудзь даведацца пра лёс дзеда, — расказвае Дар'я Паляўцова. — Гэтыя словы запалі мне ў сэрца, у галаву. Я моўчкі адкрыла інтэрнэт, увяла прозвішча, імя, імя па бацьку. Спасылкі выдалі запыты, якія раней пакідалі блізкія пры пошуку прадзеда. Я пачала прагортваць спасылкі на розных расійскіх сайтах з інфармацыямі пра вайскоўцаў Чырвонай Арміі і выйшла на спісы Маргарыты Кацікоўскай, якая была юрыстам на Нюрнбергскім працэсе. Яе зацікавіла, што ў канцлагер Дахау траплялі людзі, а пасля прападалі. І яна знайшла інфармацыю пра расстрэлы ваеннапалонных на стрэльбішчы Хебертсхаўзен. Час ад часу я працягвала ў інтэрнэце набіраць прозвішча дзядулі і так выйшла на спіс, надрукаваны ў «Звяздзе».

Даша заклікае ўсіх, хто працягвае высвятляць лёс родных, не апускаць рукі. Сёння ў інтэрнэце выкладаецца многа архіўных дакументаў. Яе знаёмыя, у якіх таксама сваякі падчас вайны прапалі без вестак, знайшлі інфармацыю праз Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Звяртацца можна і ў пошукавую службу Чырвонага Крыжа.

— Адзін са сваякоў, што прыехаў на мерапрыемствы ў Дахау, сказаў, што вайна заканчваецца, калі даведваешся пра лёс родных, якія загінулі на ёй. Дзякуючы таму што мемарыял дапамог нам знайсці такія звесткі, наша вайна закончылася. Цяжка не ведаць — лепш сумная памяць, чым невядомасць, — упэўнена Дар'я. — І вельмі важна, што ёсць такія месцы, дзе наступныя пакаленні бачаць, што такое вайна, што тварылася, каб ніколі такога больш не было.



У Германіі ў школах праводзяцца адпаведныя заняткі для дзяцей — нам расказвалі, што многія школы з Мюнхена і Дахау праводзяць выязныя ўрокі ў гэтым месцы...

Пошукі працягваюцца. Спіс ваеннапалонных надрукаваны на нашым сайце zviazda.by. На дадзены момант вернута толькі каля 900 прозвішчаў. Даследчыкі хочуць, каб гэтая лічба дасягнула хоць бы паўтары—дзве тысячы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*Фота прадстаўлены сем'ямі, генконсульствам.*

З гісторыі пытання

# КРОК У БУДУЧЫНЮ

## Што такое Дэкрэт № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі» і як ён працуе?

**Тое, што ў Беларусі развіваецца IT-сфера, было відаць няўзброеным вокам і раней. Гэта датычыцца не толькі заробкаў — асобныя айчынныя кампаніі ствaралі якасныя прадукты, якія станавіліся паспяховымі па ўсім свеце. Па прыклады далёка хадзіць не трэба — той жа Viber, Wargaming і іншыя. Пры гэтым было зразумела, што ў наяўных умовах беларускім фірмам складана займацца распрацоўкай уласных прадуктаў. Для сапраўднага скачка трэба было памяняць правілы гульні.**

І ў 2017 годзе ад размоў перайшлі да справы, калі IT-супольнасць стала ўжо прадметна абмяркоўваць магчымыя змены і новаўвядзенні. Выступаючы са штогадовым Пасланнем парламенту і беларускаму народу, Прэзідэнт асабіста даручыў распрацаваць дакумент, які дазволіць прыцягнуць у Беларусь найлепшыя IT-кампаніі з усяго свету.

Над праектам працавала адміністрацыя Парка высокіх тэхналогій сумесна з рэзідэнтамі ПВТ, IT-супольнасцю, вядучымі юрыдычнымі і кансалтынгавымі фірмамі Беларусі, а таксама замежнымі экспертамі.

Справа распачалася, у інтэрнэце нават з'явіўся праект дэкрэта, вялося сур'ёзнае абмеркаванне. Аднак каментатары былі даволі скептычныя — маўляў, ідэя выдатная, аднак паглядзім, якім будзе фінальны, падпісаны варыянт.

Дэкрэт № 8 Прэзідэнт падпісаў 21 снежня 2017 года, а 28 сакавіка 2018 года дакумент паўнавартасна запрацаваў. Якія навацыі ён прынёс?

Усе назвалі яго рэвалюцыйным. Ключавыя палажэнні дэкрэта: пашырэнне віdaў дзейнасці рэзідэнтаў ПВТ, падтрымка IT-адукацыі, падрыхтоўка кадраў для галіны, стварэнне ўмоў для развіцця прадуктовых IT-кампаній, комплекснае прававое рэгуляванне бізнесаў на аснове тэхналогіі блокчэйн.

У ім пазначаныя новыя віды дзейнасці рэзідэнтаў Парка — распрацоўка біятэхналогій, медыцынскіх, авіяцыйных і касмічных тэхналогій, кіберспорт.

Найважнейшы момант: дакумент стварыў прававыя ўмовы для правядзення ICO, выкарыстання крыптавалюты і ўкаранення смарт-кантрактаў. Такім чынам, Беларусь стала першай у свеце юрысдыкцыяй з комплексным прававым рэгуляваннем бізнесаў на аснове тэхналогіі блокчэйн. Па гэтай тэме — ніякіх абмежаванняў і спецыяльных патрабаванняў.

Нарэшце, дэкрэтам створаны ўмовы для развіцця прадуктовых IT-кампаній. З'явілася магчымасць заключаць знешнеэканамічныя здзелкі ў электронным выглядзе.

Таксама дакумент увёў асобныя інстытуты англійскага права.

Быў замацаваны комплекс мер для прыцягнення ў краіну высокакласных спецыялістаў у IT-сферы. Тлумачым: рэзідэнтам ПВТ не патрабуецца атрымліваць дазвол, звязаны з прыёмам на работу замежнікаў. Ім у спрошчаным парадку выдаецца дазвол на часовае пражыванне ў Беларусі, для замежных работнікаў і заснавальнікаў рэзідэнтаў ПВТ візы былі адменены.

І гэта мы яшчэ не кажам пра мноства падатковых ільгот, прадугледжаных для рэзідэнтаў ПВТ.

Пра вынікі лепш за ўсё скажа статыстыка: у 2018 годзе да ПВТ у якасці рэзідэнтаў далучыліся амаль 200 кампаній — больш, чым за ўсю 12-гадовую гісторыю Парка. Прыбытак расце, расце і колькасць занятых у гэтай сферы. Тое, што многім каментатарам, ды і некаторым удзельнікам IT-супольнасці здавалася першапачаткова неймаверным, стала рэальнасцю.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**




# Беларусь —

**Лічба сёння паўсюль: мы карыстаемся безнаяўнымі кашалькамі, купляем электронныя білеты ў кіно, нават у каханні прызнаёмся праз смартфон. Што чакае сферу інтэлектуальных тэхналогій, якая рэальная мэта «лічбавага» дэкрэта і чаму айцішнік — звычайны чалавек, разважае дырэктар кампаніі LWO Алег КАНДРАЦЕНКА.**
**LWO ўваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых пастаўшчыкоў праграмнага забеспячэння на ўнутраны рынак, працуе ў асноўным з банкамі і дзяржаўнымі ўстановамі.**
**З 2013 года — рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій.**



***— Алег Васілевіч, кампанія LWO на рынку з 2008 года. Прааналізуйце, калі ласка, як падпісаны Прэзідэнтам у канцы 2017-га Дэкрэт «Аб развіцці лічбавай эканомікі» паўплываў на работу кампаній? Што можна адзначыць якасныя змяненні?***

— Дэкрэт стварыў магчымасць новых пунктаў росту для найбольш сучасных і дынамічных сегментаў эканомікі. Гэта важна — не толькі і не столькі для самой IT-сферы, колькі для эканомікі краіны ў цэлым.

У пачатку 2017 года гэты дакумент здаваўся цяжказдзяйсняльнай марай, чаканнем — падобна да



надзеі на перамогу справядлівасці, сумленнасці і адкрытасці. Як гэтыя сутнасці не могуць жыць без рэальнай падтрымкі, так і Дэкрэт «Аб развіцці лічбавай эканомікі» меў патрэбу ў добрай волі і прагматычнай сіле.

Перш за ўсё велізарнае дзякуй кіраўніку дзяржавы. Дзякуючы яго смелым і валявым рашэнням у нас ёсць такі важны і патрэбны краіне дакумент.

Наш Прэзідэнт падтрымаў самыя смелыя ідэі беларускай IT-суполкі, і сёння мы яўна бачым эфект ад восьмага дэкрэта. Летась у Парк высокіх тэхналогій прыйшло каля 300 кампаній — гэта больш, чым за ўсю 12-гадовую гісторыю ПВТ. Таксама імклівa ўзляцеў экспарт IT-паслуг (на 40 % па мінулым годзе) — гэта ледзь не 1,5 мільярда долараў. Адкрываюцца новыя цэнтры распрацовак міжнародных кампаній. Беларусь становіцца ціхай IT-гаванню для праграмістаў з усяго свету.

Цяпер дзяржава насамрэч павярнулася тварам да IT. Пачынаецца працэс лічбавізацыі — вельмі актыўныя ў гэтым плане першы віцэ-прэм'ер Аляксандр Турчын, кіраўніцтва Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце і Нацыянальнага банка.

Дэкрэт № 8 стаў важнай вяхой, яго ўжо назвалі і «ледаколам, які ўзламаў лёд і адкрыў моры для нашых караблёў», і «доўгачаканым, жыццёва важным інструментам», і «крыніцай аазіса для знямоглага ў пустыні». Усё гэта — пра дакумент, які даў празрыстыя правілы работы і зняў крытычныя для развіцця інфармацыйных тэхналогій абмежаванні, якія не дазвалялі будаваць сапраўды патрэбныя сістэмы.

***— Пры распрацоўцы дакумента ўлічваліся патрэбы тых, хто непасрэдна заняты ў гэтай сферы. Вы ўносілі свае прапановы, дзяліліся думкай? Як, на ваш погляд, Дэкрэт № 8 паўплываў на сітуацыю ў сферы высокіх тэхналогій у цэлым па краіне?***

— Увогуле я з прыемным пачуццём успамінаю работу над Дэкрэтам. Працавалі вельмі дружна і дзяржаўныя структуры, і IT-суполка. Вельмі камфортна было кантактаваць з новым дырэктарам Парка высокіх тэхналогій Усеваладам Янчэўскім — разумным і энергічным чалавекам, які каардынаваў і, можна сказаць, натхняў увесь гэты працэс.

Што асабліва каштоўна, Дэкрэт № 8 быў распрацаваны і падпісаны ў самы кароткі час і ўтрымліваў у сабе самыя рэвалюцыйныя пункты: ад магчымасці вытворчасці беспілотных аўтамабіляў і касмічных апаратаў да нормаў міжнароднага права і здзелак праз смарт-кантракт. Гэты дакумент спрацаваў яшчэ і як добрая рэклама для Беларусі ва ўсім свеце. Мы трапілі ў загалоўкі ўсіх сусветных таблоідаў, што дало свой эфект.

***— На ваш погляд, нашы законы паспяваюць за развіццём сферы высокіх тэхналогій? Якія яшчэ нарматыўна-прававыя акты неабходна ўдасканаліць, каб у поўнай меры рэалізаваць магчымасці Дэкрэта № 8?***

— Напрыклад, у нас у краіне 20 гадоў таму быў слушна прыняты кірунак на павелічэнне долі безнаяўных плацяжоў у эканоміцы. Паступова ўсе прывыклі да выкарыстання пластыкавых картак. Сёння жыццё паказвае, што абсалютна ўсё сыходзіць у анлайн. Ужо ёсць беларускія плацежныя сэрвісы, якія працуюць падобна да картаў міжнародных плацежных сістэм, напрыклад, з дапамогай мабільнага тэлефона.

Праведзена вялікая работа: на рынак выходзяць прадукты, якія не толькі працуюць на карысць эканомікі

# ціхая IT-гавань

нашай роднай Беларусі, але і выконваюць функцыі абароны айчыннай плацежнай сістэмы. І тут Нацыянальны банк, як рэгулятар, ужо пачаў работу па ўнясенні змяненняў для магчымасці выкарыстання такіх сэрвісаў.

**Летась у Парк высокіх тэхналогій прыйшло каля 300 кампаній — гэта больш, чым за ўсю 12-гадовую гісторыю ПВТ. Таксама імкліва ўзляцеў экспарт IT-паслуг (на 40 % па мінулым годзе) — гэта ледзь не 1,5 мільярда долараў.**



Абмеркаванне праграмы.

Акрамя таго, рознічны бізнес не павінен будзе купляць дарагія тэрміналы. Выкарыстоўваючы найноўшыя плацежныя прадукты, мы знізім выдаткі прадаўцоў, узмоцнім канкурэнцыю, а плаціць безнаяўна для многіх з нас стане больш зручна, чым наяўнымі грашыма. У крамах зменшацца чэргі, а на касах пачне менш марнавацца паперы. Будзе лягчэй разбіраць спрэчныя сітуацыі пры аплаце хоць прадуктаў у бабулі на рынку, хоць здымнай кватэры студэнтам. Празрыстасць будзе яшчэ вышэйшая, умовы пачаць або весці бізнес — лягчэйшыя, што павысіць узровень жыцця нашых грамадзян. А гэта і ёсць рэальная мэта лічбавага Дэкрэта.

## Сацыяльная палітыка высокіх тэхналогій

***— Апошнім часам можна чуць, як сферу высокіх тэхналогій некаторыя называюць «мыльнай бурбалкай», — маўляў, дасягне сваёй столі і «лопне». Якія, на ваш погляд, перспектывы адкрываюцца перад IT-сферай на найбліжэйшыя гады?***

— Наша кампанія ў асноўным працуе на праектах унутры краіны, але дзякуючы імпульсу Дэкрэта № 8 мы ўжо выйгралі некалькі тэндэраў па праектах лічбавізацыі банкаў за мяжой. Свет мяняецца фантастычна хутка. Ёсць дэфіцыт на лічбавыя сэрвісы, і ён расце такімі тэмпамі, што пастаянным апошнім часам застаецца толькі павелічэнне патрэбы ў новых распрацоўках. Сёння мы плацім амерыканскім і іншым замежным плацежным сістэмам дзясяткі мільёнаў долараў у год... А можам плаціць у 5—10 разоў менш. Вось і адказ, навошта нашы беларускія інтэлектуальныя рашэнні.

***— Ваша кампанія налічвае звыш чатырох сотняў супрацоўнікаў. Ацаніце, калі ласка, кадравую сітуацыю ў сферы. Некаторыя кампаніі вымушаны прыцягваць замежных спецыялістаў — а як у вас? Які ў кампаніі падыход да кадравай палітыкі: прымаеце на работу маладых спецыялістаў, вучыце самі ці «перакупляеце» прафесіяналаў?***

— Кампанія LWO — наша, беларуская. У яе беларускія карані і, паколькі асноўныя нашы спажыўцы — унутры краіны, то і плаціць нам па ўнутраных расцэнках. Мы рыхтуем кадры, шукаем прафесіяналаў... Аднак ёсць канкурэнтнае асяроддзе, ёсць цяжкасці, калі працуеш на ўнутраным рынку. Але мы разумеем: калі не мы, то хто? Пры гэтым прапагандуем сямейныя каштоўнасці, прэміруем людзей за вяселле, за нараджэнне дзіцяці. Сёння мы праводзім сацыяльную палітыку, даём беспрацэнтныя пазыкі ў рублях на 3—5 гадоў, каб IT-спецыялісты заставаліся ў краіне.

***— А які наогул, на ваш погляд, узровень нашай адукацыі ў IT-сферы? Праграмы ў ВНУ пастаянна адаптуюцца, але ці дастаткова? Паспяваем за развіццём у галіне або даводзіцца давучваць спецыялістаў на месцах?***

— Шмат хто кажа, што нашы адукацыйныя праграмы недастатковыя, што іх патрабуецца дапрацоўваць, змяняць. І мы, відома ж, шмат у чым «за» гэтыя прапановы. Вось толькі я катэгарычна супраць меркавання, што ў нас усё дрэнна, сістэма адукацыі благая і так далей. Гэта проста няпраўда. Паляпшаць яе можна і вельмі трэба, варта змяняць, але ж заўсёды і ўсюды, хоць нават у Англіі, студэнт пасля ВНУ не гатовы да рэальнай работы. Для гэтага ёсць рознага роду практыкі, сістэмы, ёсць інструменты навучання ўнутры прадпрыемстваў. Гэта велізарная праца, і кожная з краін яе робіць па-свойму, а калі беларуская сістэма адукацыі будзе ўдасканалена, — гэта толькі лепш для ўсіх нас.

**Дэкрэт № 8 стаў важнай вяхой, яго ўжо назвалі і «ледаколам, які ўзламаў лёд і адкрыў моры для нашых караблёў», і «доўгачаканым, жыццёва важным інструментам», і «крыніцай аазіса для знямоглага ў пустыні».**

І тут не варта казаць, што айцішнікі — гэта выбраныя. Не, яны звычайныя, якія проста працуюць, як і ўсе грамадзяне краіны... І хочуць быць лепшымі, хочуць быць патрэбнымі і запатрабаванымі перш за ўсё ў сябе на Радзіме.

**Варвара МАРОЗАВА.**



Праграмісты за работай.

## Каментарый у тэму

## «IT — гэта ўнікальны шанц для любога чалавека атрымаць поспех у сусветным маштабе»

**Такую думку выказаў вядомы беларускі бізнесмен Дзмітрый ГУРСКІ па выніках сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з прадстаўнікамі IT-сферы ў Парку высокіх тэхналогій.**



«Я ўспамінаю час два гады таму: гэта была вясна, паступіла даручэнне ад Прэзідэнта падрыхтаваць дакумент, які разняволіць IT-галіну. Мы папрацавалі, сабралі ўсе праблемы — атрымаўся такі доўгі-доўгі спіс, у сотні пунктаў. Многія з іх былі рэвалюцыйныя. Ніхто не верыў, што Прэзідэнт падпіша, таму што занадта рэвалюцыйна, занадта складана, занадта шмат аспектаў, — але Прэзідэнт падпісаў. Гэта быў велізарны імпульс веры ў тое, што ў нашай галіны ўсё будзе добра. Бо, у прынцыпе, гэта самае галоўнае: калі чалавек разумее, што ўсё будзе добра, ён пачынае інвеставаць, ён пачынае лепш працаваць, ён пачынае расці», — падкрэсліў Дзмітрый Гурскі.

Паводле яго слоў, той візіт беларускага лідара ў Парк высокіх тэхналогій толькі ўзмацніў аптымізм — зразумела, што ў адносінах дзяржавы і IT усё будзе ў парадку. Такім чынам, сумесна з ростам аптымізму будзе адбывацца рост галіны, упэўнены бізнесмен.

Чаго цяпер не хапае ў IT? На яго думку, ёсць адна буйная праблема — гэта кадры. У прыклад ён прывёў канкрэтныя лічбы: цяпер у Беларусі каля 50 тысяч праграмістаў. Гэта значыць, на кожную сотню эканамічна актыўнага насельніцтва прыпадае адзін праграміст. Аднак у той жа Эстоніі іх тры на 100 чалавек, у Ізраілі і Славеніі — чатыры на 100, нават у Польшчы — два на 100. Дзмітрый Гурскі падкрэсліў: такая сітуацыя ў нашай краіне з кадрамі вельмі моцна абмяжоўвае развіццё галіны.

«Дзякуючы ПВТ у нас сталі высокія зарплаты, яны вышэй за маскоўскія. Калі раней мы бачылі паток людзей, якія з'язджаюць у Маскву — гадоў 15 таму, бо там былі заробкі вышэйшыя, — цяпер людзі едуць да нас. Мы асабіста рэлацыруем вельмі шмат людзей з Расіі з прычыны кадравага дэфіцыту», — дадаў бізнесмен.

Ён таксама звярнуў увагу, што кадравы дэфіцыт — гэта не толькі нерэалізаваныя магчымасці бізнесу, але і нерэалізаваныя магчымасці людзей. «IT — гэта ўнікальны шанц для любога чалавека атрымаць поспех у сусветным маштабе. Таму што ты можаш жыць тут, а зарабляць там. І ты можаш рабіць сусветны поспех, будучы тут».

У прыклад бізнесмен прывёў сябе самога: ён нарадзіўся ў простай сям'і, рос без бацькі, выхоўваўся бабуляй і мамай, «карміўся з агарода». Стартавага капіталу, зразумела, не меў. «Усё было проста, зусім нічога асаблівага, — сказаў ён. — Зараз я стварыў кампанію, якая з'яўляецца сусветным лідарам у сваёй вобласці [Дзмітрый Гурскі — заснавальнік і прэзідэнт кампаніі Flo Health Inc. — распрацоўшчыка мабільнай праграмы для жанчын Flo. — **«Зв.»**]. Нашы карыстальнікі — гэта кожная дзясятая жанчына Амерыкі, у нас 25 мільёнаў карыстальнікаў у месяц, гэта самы буйны праект у сваёй галіне ў свеце. Гэта сусветны поспех і прыклад таго, што я застаюся ў Беларусі, жыву тут, я падаткова рэзідэнт Беларусі, нікуды не збіраюся».

Бізнесмен і яго калегі актыўна дапамагаюць дзецям з рэгіёнаў, каб яны маглі ўцягнуцца ў IT-сферу. Дзмітрый Гурскі падкрэсліў: важна паказаць гэтую мадэль, бо нічога ўнікальнага ў IT-спецыялістах няма. «Гэта звычайныя людзі, проста яны пайшлі ў вобласць, якая дазваляе добра зарабляць. І мы хочам паказаць дзецям з правінцыі, што ёсць такі шлях», — сказаў ён.

Аднак на сёння, дадаў бізнесмен, іх магчымасці некалькі абмежаваныя: набор у вышэйшыя навучальныя ўстановы маленькі, а конкурс — вялікі, прахадныя балы — высокія. Платную адукацыю пацягне далёка не кожная сям'я, саманавучанне таксама няпростая справа. Такім чынам, комплексная работа для ПВТ і дзяржавы — даць магчымасць таленавітым дзецям уцягнуцца ў галіну.

«Я лічу, што самая галоўная задача ПВТ (зразумела, што экспарт, мільярды — усё гэта важна) — інтэнсіўна працаваць на тое, каб у значна большай колькасці нашых людзей была магчымасць скарыстацца шанцам і дасягнуць гэтай беларускай мары — сусветнага поспеху, жывучы ў Беларусі. Я са свайго боку хачу працягнуць гэтую работу, але павінны ўключыцца ўсе: і ПВТ павінна змяніць сваю місію і накіраваць на гэта свае рэсурсы, і IT-галіна, і дзяржава. Мы ўсе павінны аб'яднацца ў тым, каб даць шанц усім удзельнічаць у гэтым поспеху», — падкрэсліў Дзмітрый Гурскі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

**7 августа 2019 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №10-А/2019**

## о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | В районе ул. Виноградной (участок № 5) | 340100000002006308 | 0,1159 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Ограничений в использовании не имеет | 99 | 8 576,60 | 400,00 | 2 921,74 |
| 2 | Ул. Лепешинского (в районе жилого дома № 147) | 340100000002006309 | 0,1335 | | Ограничений в использовании не имеет | 99 | 9 879,00 | 400,00 | 3 578,54 |
| 3 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 691 по генплану) | 340100000008002555 | 0,0840 | | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений | 99 | 5 779,20 | 200,00 | 2 836,44 |

1. Организатор аукциона — Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3—6, № 3—14).
3. **Аукцион состоится 7 августа 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа — оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 — для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) — это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
Необходимые документы:
4.1 граждане — копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь — доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели — копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина — легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 2 июля по 5 августа 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед: 12.00—13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3—6 и 3—14.**
Контактные телефоны: +375 232 30 12 46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by

## Извещение о повторном аукционе 17 июля 2019 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв. м) | 3982,2 | 3482,1 | 1930,1 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 1,444 | | 0,3941 |
| Начальная цена продажи | 118 187,95 | 66 546,46 | 341 298,70 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка | 11 818,80 | 6 654,65 | 34 129,87 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов площадью 3982,2 $м^2$. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м., беседка, бетонное покрытие – 2290,2 $м^2$. Ввод в эксплуатацию — 1973 г. | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная) Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной 306 $м^2$, помещение ремонтно-механического участка 294 $м^2$, помещение цеха доборных изделий 1456 $м^2$, пристройка 12 $м^2$, навес 24 $м^2$, градирня 33 $м^2$, два теневых навеса 7 $м^2$. Покрытие бетонное 1030 $м^2$. Ввод в эксплуатацию — 1970 г. |

| | |
|---|---|
| Наименование объекта | Комплекс зданий и сооружений (помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центом с инвентарным номером 130D-58321; склад готовой продукции с инвентарным номером 130/С-44660; очистные сооружения с инвентарным номером 130С-44951; комплект гаражей с инвентарным номером 130/С-44658; железнодорожный путь с инвентарным номером 130/С-44660) |
| Номер лота | 6 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-1 |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| Общая площадь (кв. м) | |
